# ПАЛАЖЭННЕ
# аб рэсурсным цэнтры беларускай мовы і літаратуры ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Старыя Дарогі імя Героя Савецкага Саюза"

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Палажэнне вызначае мэты, задачы, арганізацыю дзейнасці, накірункі работы, структуру, фінансаванне рэсурснага цэнтра беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы №1 (далей-Цэнтр).

1.2. У сваей дзейнасці Цэнтр кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, нарматыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі, упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама, аддзела адукацыі Старадарожскага райвыканкама і дадзеным палажэннем.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ РЭСУРСНАГА ЦЭНТРА

2.1. Асноўнай мэтай дзейнасці Цэнтра з'яўляецца ўдасканальванне і сістэматызацыя дзейнасці настаўнікаў-філолагаў школы па ўкараненні сучасных адукацыйных і інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій і распаўсюджванне вопыту работы па дадзенай праблеме.

2.2. Задачамі Цэнтра з'яўляюцца:

- стварэнне ўмоў  для авалодання і ўкаранення настаўнікамі сучасных адукацыйных і інфармацыйна-камп'ютарных сродкаў;
- ажыццяўленне інфармацыйнай і навукова-метадычнай падтрымкі адукацыйнага працэсу па рэалізуемым напрамку;
- вядзенне навукова-даследчай, інавацыйнай, праектнай дзейнасці;
- кансультаванне педагагічных работнікаў школы;
- прапаганда і распаўсюджванне прагрэсіўнага педагагічнага вопыта моўна-літаратурнай адукацыі;
- пашырэнне матывацыйнай дзейнасці вучняў праз стварэнне ўмоў для індывідуалізацыі вучэбна-пазнавальнай і інтэлектуальнай дзейнасці;
- стварэнне станоўчага іміджа школы;
- эфектыўнае выкарыстанне матэрыяльных, фінансавых і кадравых рэсурсаў.

## 3. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ

3.1. Арганізацыйна-метадычная работа.

Выкарыстанне матэрыяльна-тэхнічных, педагагічных, інфармацыйных, інтэлектуальных, праграмна-метадычных рэсурсаў для

- падрыхтоўкі і правядзення навукова-практычных канферэнцый, семінараў, курсаў павышэння кваліфікацыі;
- падрыхтоўкі ўдзельнікаў конкурсаў прафесіянальнага майстэрства педагагічных работнікаў;
- удзелу ў рэалізацыі абласных, раённых, школьных педагагічных праектаў;
- садзейнічання функцыянаванню школьных метадычных аб'яднанняў;

- арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці вучняў;

- арганізацыі метадычных кансультацый.

3.2. Інфармацыйна-метадычная работа:

- удзел у фарміраванні банка педагагічнай і метадычнай інфармацыі;

- вывучэнне перспектыўнага педагагічнага вопыту і дасягненняў у сістэме агульнай адукацыі і іх распаўсюджванне;

- удзел у распрацоўцы прыкладнай вучэбна-праграмнай дакументацыі;

- распрацоўка і ўкараненне інавацыйных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій;

- распрацоўка зместу, арганізацыі і метадычнага суправаджэння конкурсаў прафесійнага майстэрства;

- арганізацыя і правядзенне педагагічных канферэнцый, семінараў, практыкумаў і т.д.;

- правядзенне навукова-даследчых, праектных работ;

- фарміраванне бібліятэкі сучаснай вучэбна-метадычнай і педагагічнай літаратуры;

- авалодванне інфармацыйнымі тэхналогіямі новага пакалення, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі рэальнага часу, хуткасным абменам інфармацыі і інш.;

- удзел у фарміраванні аўдыявізуальных і інтэрактыўных сродкаў навучання для правядзення вучэбнай і пазакласнай работы па прадметах;

- стварэнне медыятэкі па прадметах для работы з педагогамі і вучнямі школы;

- інфармацыйная і навукова-метадычная падтрымка навучальнага працэсу;

- арганізацыя і ажыццяўленне выставачнай дзейнасці па прапагандзе новых інфармацыйных тэхналогій;

- арганізацыя кансультацыйнай дзейнасці па ўсіх пытаннях фунуцыянавання школы;

- узаемадзеянне з іншымі інфармацыйна-рэсурснымі цэнтрамі.

## 4. АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ РЭСУРСНАГА ЦЭНТРА

4.1. Дзейнасць Цэнтра ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дадзеным Палажэннем і планам работы Цэнтра, зацверджаным дырэктарам школы.

4.2. У канцы навучальнага года Цэнтр дае справаздачу адміністрацыі школы.